СУСТРЭЧЫ




# «ВЫХАД У СВЕТ» ПА-СУСЕДСКУ

**ЛІДА. 17 студзеня адбылася чарговая праверка літаратурных сіл Прынёмання. У літаратурнай гасцінай «Выхад у свет» выступілі прадстаўнікі адразу некалькіх рэгіёнаў і творчых саюзаў. Ганаровым госцем мерапрыемства стаў член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, краязнавец Уладзімір Руль (Воранаўскі раён).**

Для даведкі. Ужо вядомая далёка за межамі Лідчыны літаратурная гасціная «Выхад у свет» існуе ў другім па велічыні горадзе Гродзенскай вобласці з 2019 года. Яе ініцыятары і куратары – лідскія паэты Руслан і Святлана Піваваравы. Праект аб'ядноўвае прадстаўнікоў мясцовай літаратурнай супольнасці, а гэта Лідскае раённае літаратурнае аб'яднанне «Суквецце» (кіраўнік паэт Уладзімір Глінін) і акрэдытаваная ў Лідзе Міжнародная літаратурная суполка «Чертог поэта» (кіраўнік член Саюза пісьменнікаў Беларусі», паэт Руслан Піваварaў). Некалькі гадоў таму запрашэнне да супрацоўніцтва з праектам «Выхад у свет» атрымаў калектыў Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі (старшыня заслужаны дзеяч культуры Беларусі, паэтэса, празаік, перакладчык Людміла Кебіч). У рамках праекта сваю творчасць паспелі прадэманстраваць нямала літаратараў з абласнога цэнтра. Прычым спачатку гэта былі пачаткоўцы, невядомыя аўтары, таленавітая моладзь. Пачынаючы з восені 2024 года (з уступленнем у шэрагі СПБ аднаго з арганізатараў гасцінай Руслана Піваварава), перад лідскімі калегамі і аматарамі чытання выступаюць выключна члены Саюза пісьменнікаў Беларусі. Гродзенскім куратарам (рэзідэнтам) літаратурнай гасцінай у Лідзе ўжо два гады з'яўляецца член СПБ, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык.

І першае ў 2026 годзе пасяджэнне літгасцінай «Выхад у свет» (гарадская бібліятэка № 4 г. Ліды) адбылося з удзелам гасцей. З прэзентацыяй сваёй разнапланавай творчасці выступіў госць з суседняга з Лідчынай Воранаўскага

раёна, член СПБ, паэт, краязнавец Уладзімір Руль. Госць з Гродна Дзмітрый Радзівончык прачытаў уласны [артыкул](#) з крытычным аглядам творчасці свайго калегі па СПБ для больш змястоўнага прадстаўлення. Прэзентацыя творчасці Уладзіміра Валяр'янавіча насіла характар творчай сяброўскай гутаркі з калегамі-аднадумцамі. Вельмі прыемна, што сярод прысутных знайшліся і яго землякі. Прагучалі вершы з разрадаў філасофскай, інтымнай, грамадзянскай лірыкі, а таксама гумарыстычная, нават сатырычная байка. Пісьменнік пазнаёміў аўдыторыю з кнігай для дзяцей, са зборнікам песень на яго словы, а таксама са сваёй краязнаўчай працай, акцэнтаваў увагу на яе асаблівасцях і праблемах. Адбыліся прэзентацыі кніг паэта: «На зорных шалях вечнасці»; «За крок да песні»; «Як Зай пахваліўся сабой»; «Развітанне Марылі з Адамам», краязнаўчай кнігі «Пра Нарбутаў моўлю я слова…». Значную частку творчага багажу паэта склалі лірычныя прысвячэнні землякам, сучаснікам, калегам, а таксама класікам, папулярным спевакам (з некаторымі ён нават сябрue – з Анатолем Ярмоленкам, Ядзвігай Паплаўскай, Львом Лешчанкам, Алегам Газманавым). Падзяліўся творца і сваімі задумамі ў галіне грамадскіх дабрачынных праектаў. Адметнай рысай паэзіі Уладзіміра Руля з'яўляецца іронія (самаіронія, эксцэнтрычнасць). З пачуццём гумару ў пісьменніка ўсё ў поўным парадку. Калі гаворка зайшла пра справу вельмі сур'ёзную – гісторыю роднага краю, – у зале адчулася ажыўленне. Гэта яшчэ раз дэманструе – наколькі тонкай матэрыяй з'яўляецца гістарычная праўда, як глыбока яна цікавіць нашых людзей і наколькі мае патрэбу ў абароне.




Пра такіх людзей, як Уладзімір Валяр'янавіч Руль, кажуць: «чалавек з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй». Ён сапраўды вельмі ўважлівы да навакольнага свету, стараецца актыўна адгукацца на розныя з'явы ды падзеі, на тое, што не можа не цікавіць і не турбаваць наш народ. У апошні час намеціўся недахоп публічных выступленняў пісьменніка. І сустрэча ў літаратурнай гасцінай «Выхад у свет» – спроба выправіць становішча. Нарадзіўся паэт 3 верасня 1953 года ў вёсцы Матылі Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Першамайскай СШ гэтага ж раёна ў 1970 годзе. У 1975 годзе закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, а ў

1992 годзе – Мінскі дзяржаўны педінстытут імя А. М. Горкага. Працаваў інжынерам-электрыкам у калектыўных гаспадарках Шчучынскага і Воранаўскага раёнаў, інструктарам аргаддзела Воранаўскага РК КПБ, сакратаром партарганізацыі мясцовага калгаса «Светлы шлях». Выкладаў гісторыю спачатку ў Енчынскай базавай, а затым у Нацкай сярэдняй школах Воранаўскага раёна. Вершы і артыкулы Уладзіміра Руля, пачынаючы з 2000 года, друкуюцца ў мясцовых і рэспубліканскіх выданнях. Лаўрэат конкурсу «Серебряные строки», праведзенага газетай «Белорусская нива» (2004). За аўтарскі зборнік вершаў «На зорных шалях вечнасці» атрымаў дыплом першай ступені на рэспубліканскім конкурсе, прысвечаным 125-годдзю з дня нараджэння Я. Коласа ў Мінску. Жыве ў вёсцы Нача Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці.




Студзеньская сустрэча яшчэ раз даказала, што выступаць у літаратурнай гасцінай «Выхад у свет» (г. Ліда) вельмі прыемна. Сустракаюць тут вельмі цёпла, па-сяброўску і па-суседску, што насамрэч у Беларусі – норма, нацыянальная (а на Гродзеншчыне інтэрнацыянальная) традыцыя. Падчас прэзентацыі творчасці члена СПБ Уладзіміра Валяр’янавіча Руля (Воранаўскі раён) можна было ў чарговы раз у гэтым пераканацца.



Працягам мерапрыемства, якое правёў кіраўнік Лідскага раённага літаб’яднання «Суквецце», паэт Уладзімір Глінін, сталі выступленні лідчан. Мясцовыя творцы Ала Юшко, Лілія Каранеўская-Радзевіч, Святлана Піваварава, Андрэй Архіпаў, Валерый Мацулевіч, Уладзімір Глінін, Ігар Вербавік, Лілія Пушкарова прадставілі паэтычныя рэфлексіі на падзеі грамадскага і культурнага жыцця, прысвяцілі свае творы тэмам Новага года, зімы, Божага нараджэння, свята Вадохрышча і іншым. Лідская краязнаўца, пісьменніца-педагог Наталля Анашкевіч падарыла госцю з суседняга раёна сваю кнігу пра літаратурную Лідчыну. Госць атрымаў і памятны падарунак ад гаспадароў, а сам пакінуў свае кнігі ў бібліятэцы. Шчыра парадавала і тое, што наша літаратурнае сяброўства вытрымала выпрабаванне суровымі ўмовамі надвор’я. Вытрымала з поспехам.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** пасяджэнне літаратурнай гасцінай «Выхад у свет» з удзелам госця з Воранаўшчыны, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэта, краязнаўца Уладзіміра Руля. Ліда, гарадская бібліятэка №4. 17 студзеня 2026 года.



Вядучы сустрэчы У. І. Глінін




Дзмітрый Радзівончык і Уладзімір Руль (СПБ)







Член СПБ, публіцыст, літаратуразнавец Дзмітрый Радзівончык (Гродна) прывітаў прысутных і прадставіў госця з Воранаўшчыны


Даведачны фонд
Уладзімір Руль
За крок да песні
Владимир Руль
За шаг до песни






Прэзентацыя зборніка артыкулаў «Воранаўскія чытанні-2023» з артыкулам пра творчасць паэта Уладзіміра Руля



Лілія Каранеўская-Радзевіч –
зямлячка У. В. Руля




Адна з ініцыятараў літаратурнай гасцінай «Выхад у свет»,
лідская паэтэса Святлана Піваварава




Паэт Ігар Вербавік




Валерый Мацулевіч




Лілія Пушкарова




Андрэй Архіпаў




Уладзімір Глінін



Ала Юшко



Уладзімір Руль і Наталля Анашкевіч







Уладзімір Руль і Святлана Піваварава



Кнігі паэта Уладзіміра Руля (Воранаўскі раён) застаюцца ў фондзе адной з лідскіх бібліятэк

Выход в свет







Усе разам





**Фота**
Дзмітрыя Радзівончыка, Святланы Піваваравай і Уладзіміра Глініна

www.pisateli.by